# КОНКУРС ЯК ПРЫЕМ ПРАВЕРКІ ДАМАШНЯГА ЗАДАННЯ ПА ЛІТАРАТУРНЫМ ЧЫТАННІ

***Знавец В. П.*** *(УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, г. Мазыр)*
***Навуковы кіраўнік –*** *А. В. Солахаў, канд. філал. навук, дацэнт*

Праверка дамашняга задання – адзін з найважнейшых этапаў урока літаратурнага чытання. Аднак практыка паказвае, што настаўнік падыходзіць да яе, у большасці выпадкаў, фармальна, правяраючы яго ўсяго ў некалькіх вучняў. Большасць жа вучняў на гэтым этапе ўрока адседжваецца і, як вынік, перастае дома чытаць, рыхтаваць пераказы, завучваць на памяць вершы. Таму пошук найбольш эфектыўных прыемаў праверкі дамашніх заданняў па літаратурным чытанні з'яўляецца вельмі актуальным. Мэтай нашага даследавання з'явілася праверка эфектыўнасці такога пры ему як конкурс. Для гэтага мы выкарыстоўвалі метады назірання, часавага замеру, анкетавання вучняў. Эксперымент праводзіўся ў 4 «Г» класе, на базе ДУА "Сярэдняя школа № 15 г. Мазыра".

Конкурс (ад лац. *concursus* збег, сутыкненне) – спаборніцтва для выяўлення найлепшых з ліку ўдзельнікаў, прадстаўленых работ, мастацкіх твораў і інш. [1, с. 407].

Конкурс забяспечвае ўмовы, у якіх кожны ўдзельнік можа праверыць свае веды, уменні, здольнасці. У калектыўнай барацьбе за перамогу фарміруюцца маральныя перакананні вучняў, іх погляды, выпрацоўваецца патрэбнасць у маральным самавыхаванні.

Задачы правядзення конкурсу: 1) павышэнне цікавасці малодшых школьнікаў да чытання; 2) пашырэнне чытацкага кругагляду вучняў; 3) павышэнне чытацкай актыўнасці; 4) пашырэнне напрамкаў чытацкіх інтарэсаў; 5) заахвочванне вучняў, якія імкнуцца да інтэлектуальнага самаразвіцця, самаўдасканалення.

Падрыхтоўчая праца да правядзення конкурсу-праверкі дамашняга задання па літаратурным чытанні прадугледжвае абавязковае паведамленне настаўніка аб ім пры запісе вучнямі дамашняга задання ў дзеннік. У класе вывешваецца прыгожая аб'ява аб яго правядзенні з указаннем месца і часу яго правядзення. Неабходнай часткай падрыхтоўчай працы да конкурсу з'яўляецца падрыхтоўка ўзнагарод (дыпломаў, грамат, медал еў і інш.), фарміраванне складу журы (2–3 чалавекі). У яго можна ўключаць бацькоў вучняў, настаўнікаў беларускай літаратуры, старшакласнікаў.

Конкурс пачынаецца з невялікага ўступнага слова настаўніка, які абвяшчае аб пачатку конкурсу, уздзельнічаць у якім могуць усе вучні. Затым настаўнік прадстаўляе вучням журы.

Для эканоміі часу ўдзельнікі конкурсу могуць выходзіць да дошкі групамі. Яны адказваюць дамашняе заданне (вывучаны верш, пераказ тэксту, выразнае чытанне твора). Адказ вучняў ацэньвае журы. Адзнака заносіцца ў бланк.

Падвядзенне вынікаў конкурсу – самы ўрачысты этап і конкурсу, і ўрока. Як лічаць даследчыкі, пры справядлівым і своечасовым абгрунтаванні адзнак, як правіла, усе дзеці настроены эмацыянальна станоўча [2, с. 61].

Журы падводзіць вынікі конкурса, абвяшчае пераможцаў, якія атрымліваюць медаль з намінацыяй «Лепшы чытальнік» або «Лепшы пераказчык». Замест медал еў можа быць выкарыстана грамата, дыплом, падарунак, салодкі прыз і інш. Іншыя ўдзельнікі конкурсу атрымліваюць медаль ўдзельніка або памятны прыз. Уручэнне медал еў (дыпломаў або прызоў) праводзіцца ва ўрачыстай абстаноўцы.

Назіранні за працай вучняў паказалі, што да правядзення конкурсу яны звычайна рыхтуюцца больш адказна, чым да звычайнай праверкі дамашняга задання на ўроку, і адказваюць больш упэўнена і прыгожа. Конкурс як пры ем праверкі дамашняга задання па літаратурным чытанні раскрывае індывідуальнасць і «схаваныя» здольнасці дзіцяці.

Анкетаванне вучняў выявіла наступнае: на пытанні, ці было вам цікава на ўроку, ці хацелі б вы, каб такія конкурсы праводзіліся часцей, усе вучні класа адказалі станоўча. На пытанне пра настрой усе напісалі: добры.

На правядзенне конкурсу і падвядзенне яго вынікаў затрачана 30 мінут урока — паказчык, які не дазваляе, аднак, праводзіць конкурсы-праверкі дамашніх заданняў часцей, таму што на зна емства з новым матэрыялам на ўроку застаецца мала часу. Але мы лічым, што адзін раз за чвэрць яго праводзіць можна. Гэта будзе спрыяць развіццю ў вучняў пазнавальных (узбагачэнне слоўнікавага запасу) і творчых (развіцц е інтуіцыі і творчага ўяўлення) здольнасцей, а таксама такіх якасцей эмацыянальнай сферы як павага да іншых, талерантнасць, схільнасць да самааналізу, настойлівасць у выкананні заданняў, спаборніцтва, пачуцце гумару.

МГПУ им. И.П.Шамякина

## Літаратура

1. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1996–2004. – Т. 8: Канто-Кулі. – 1999. – 575 с.

2. Малашенкова, Е. А. Конкурс – это интересно / Е. А. Малашенкова // Пачатковая школа: навукова-метадычны часопіс. – 2008. – № 1. – С. 61–63.

М. И. П. Ш.